ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 15(1149)
ЧАЦВЕР, 9 кастрычніка 2008 г.
~~Выходзіць два разы ў месяц~~
~~Цана~~ дагаворная

*Газета заснавана ў верасні 1969 года*

## ОБ ОЛИМПИЙСКИХ ПОБЕДАХ



…На трибунах огромного стадиона сто тысяч болельщиков в один голос поддерживают спортсменов в их упорнейших состязаниях за олимпийские награды. Ощущение такое, будто идет бой гладиаторов в Древнем Риме. Это, пожалуй, одно из самых ярких впечатлений о XXIX Олимпийских играх в Пекине, которое осталось у Андрея Кравченко после заключительного выступления соревновательной программы десятиборцев – бега на дистанции 1500 м. Стремительно опережая своего главного соперника кубинца Суареза, он достиг победоносного финиша и завоевал серебряную медаль. А вскоре после Олимпиады Андрей вновь смог доказать, что он один из сильнейших спортсменов Европы, выиграв международный легкоатлетический турнир «Звезды десятиборья», который прошел во Франции.

Успешные старты, победы, триумф А. Кравченко сменили студенческие будни. Его с радостью встретили однокурсники, студенты гр. ФК-32 факультета физической культуры, которые также очень болели за Андрея, отстаивающего спортивную честь нашей республики, Гомельского университета в Пекине и во французском Талансе. Им, конечно же, очень интересно было все узнать о соревнованиях, в которых участвовал их сокурсник, из первых уст, подержать в руках олимпийскую медаль **(на снимке в центре А. Кравченко).**



Прославил наш вуз и еще один студент факультета физической культуры. Третьекурсник Владимир Изотов, участник XIII Паралимпийских игр в Пекине, в плавании на 150 м брассом завоевал бронзовую награду **(на снимке).**. Призер Игр и его тренер – преподаватель кафедры легкой атлетики и лыжного спорта И.М. Корниенко награждены Почетными грамотами областного Совета депутатов.

**Фото В.ЧИСТИКА.**

### З Савета універсітэта

На першым у гэтым навучальным годзе пасяджэнні Савета універсітэта, якое адбылося 18 верасня, па дакладу рэктара А.У. Рагачова абмеркаваны вынікі работы ГДУ ў 2007-2008 навучальным годзе, акрэслены задачы і вызначаны перспектывы на бягучы.

Даючы ацэнку зробленаму, А.У. Рагачоў адзначыў пэўныя станоўчыя моманты ў жыццядзейнасці калектыву універсітэта: зроблены сур'ёзныя крокі ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай, лабараторнай базы, атрымалі развіццё вучэбная, навукова-метадычная работа, ёсць станоўчыя зрухі ў актывізацыі навукова-даследчай дзейнасці. Разам з тым, як адзначана, па шэрагу накірункаў прыкметнага прагрэсу не назіраецца.

Аб асноўных задачах, якія стаяць перад калектывам універсітэта, праблемах, што неабходна вырашаць, Аляксандр Уладзіміравіч гаварыў у разрэзе асноўных напрамкаў дзейнасці ГДУ. Што датычыць вучэбнай і навукова-метадычнай работы, актуальным з'яўляецца пераход на новыя адукацыйныя стандарты. Стаіць задача прывесці ў адпаведнасць з патрабаваннямі новых стандартаў вучэбна-метадычнае забеспячэнне, змест усіх відаў вучэбных заняткаў. Прадстаіць сур'ёзная работа па падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, вучэбна-метадычных комплексаў, якія б адпавядалі новым вучэбным праграмам.

Патрабуе актывізацыі дзейнасць навукова-метадычнага савета універсітэта, галоўнымі напрамкамі работы якога павінны стаць паглыбленне міждысцыплінарных сувязей, удасканаленне метадаў і прыёмаў самастойнай работы студэнтаў, развіццё інавацыйных інфармацыйных тэхналогій.

Падводзячы вынікі ўступнай кампаніі-2008, А.У. Рагачоў адзначыў праблемы, якія ўзніклі сёлета з наборам студэнтаў на бюджэтную форму па некаторых спецыяльнасцях. У сувязі з гэтым мяркуюцца змены ў правілах прыёму на філалагічны і гістарычны факультэты.

## АКЦЭНТ – НА ПРАБЛЕМЫ І НОВЫЯ ЗАДАЧЫ

У дакладзе была прааналізавана навукова-даследчая работа, што праводзіцца ва універсітэце. Пры наяўнасці станоўчых тэндэнцый – умацаванне і развіццё яе матэрыяльна-тэхнічнай базы, пашырэнне міжнародных навуковых сувязей, павелічэнне колькасці гаспадарчых дагавароў, навуковых публікацый, не вырашанымі застаюцца праблемы падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі, павышэнне эфектыўнасці аспірантуры, дактарантуры. Не на належным узроўні застаецца якасць навуковых публікацый, не эфектыўна выкарыстоўваецца унікальнае навуковае абсталяванне, патрабуе сур'ёзнай увагі арганізацыя і якасць студэнцкай навукі.

Выхаваўчая работа са студэнцкай моладдзю – вельмі важны і адказны аспект работы. Ён таксама знайшоў асвятленне ў дакладзе. У нас вельмі добрыя студэнты, адзначыў рэктар, і наша задача – зрабіць усё для таго, каб за гады вучобы яны не змяніліся ў горшы бок. Іх духоўнаму развіццю спрыяюць умовы, створаныя ва універсітэце. А вырашэнне некаторых наяўных праблем у гэтым напрамку дзейнасці будзе садзейнічаць далейшаму ўдасканаленню форм і метадаў ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў нашай вну. З мэтай павышэння навукова-метадычнай і арганізацыйнай ролі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ў ГДУ прапанавана правесці рэарганізацыю аддзела выхаваўчай работы ва Упраўленне ідэалагічнай і выхаваўчай работы, а каб пашырыць формы і метады студэнцкага самакіравання, – стварыць агульнауніверсітэцкі каардынацыйны савет.

Ішла размова і аб неабходнасці правядзення аналізу выканання, карэкціроўкі планаў развіцця факультэтаў, структурных падраздзяленняў з улікам актуальных задач, удакладнення крытэрыяў ацэнкі асноўных напрамкаў дзейнасці кафедр і факультэтаў. Вынікі дадзенай ацэнкі будуць улічвацца пры прэміраванні і вызначэнні аб'ёму матэрыяльнага стымулявання.

Рэктар А.У.Рагачоў акрэсліў таксама далейшыя перспектывы ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы ГДУ (плануецца будаўніцтва новага вучэбна-лабараторнага корпуса, інтэрната), выказаў упэўненасць, што ў бягучым навучальным годзе будзе зроблены яшчэ адзін упэўнены крок на шляху паспяховага развіцця універсітэта.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел прарэктары па навуковай і выхаваўчай рабоце А.М.Дземідзенка, С.І.Ханеня, дэкан фізічнага факультэта С.В.Шалупаеў, загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання В.І.Максімей, прафесар кафедры алгебры і геаметрыі М.В.Селькін і інш. Прынята пастанова, накіраваная на далейшае ўдасканаленне вучэбнага працэсу, яго навукова-метадычнага забеспячэння, павышэнне якасці навуковай і навукова-тэхнічнай прадукцыі, эфектыўнасці НДР, сістэмы падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, укараненне ў вучэбна-выхаваўчы працэс сучасных інавацыйных тэхналогій і г. д.

Заслухана таксама інфармацыя аб рабоце з кадравым рэзервам універсітэта. А.У. Рагачоў адзначыў, у прыватнасці, што такі рэзерв на пасады фарміруецца з ліку кіраўнікоў: прарэктараў, дэканаў факультэтаў, начальнікаў аддзелаў. Пры вылучэнні кандыдатаў у рэзерв улічваецца перш за ўсё ўзровень іх прафесіянальнай кампетэнцыі, кваліфікацыі, арганізатарскія здольнасці, дзелавыя, маральныя, лідэрскія якасці, выніковасць працы. У ходзе правядзення работы з рэзервам кіруючых кадраў асаблівая ўвага надаецца павышэнню іх кваліфікацыі. Яшчэ адзін напрамак дзейнасці па пашырэнні радоў рэзервістаў – работа з таленавітай моладдзю, якая актыўна ўдзельнічае ў навуковай, грамадскай, культурна-масавай, спартыўнай рабоце.

**Раўненне – на выдатнікаў**

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

**На падставе рашэння Савета універсітэта ад 26 ліпеня і ад 18 верасня 2008 года па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі 2007 – 2008 навучальнага года назначаны стыпендыі:**

**ІМЯ І.П. ШАМЯКІНА**

**МОХАРАВУ Аляксандру** – студэнту 5 курса спецыяльнасці «Правазнаўства».

**РОПАТ Анастасіі** – студэнтцы 5 курса спецыяльнасці «Гісторыя айчынная і ўсеагульная».

**ІМЯ А.М. СЕЎЧАНКІ**

**СІВЯНКОВУ Вадзіму, КОРЖЫКУ Руслану** – студэнтам 5 курса спецыяльнасці «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій».

**ІМЯ П. БРОЎКІ**

**ПЕТУХОВАЙ Валянціне** – студэнтцы 5 курса спецыяльнасці «Фінансы і крэдыт».

**ІМЯ Я. КУПАЛЫ**

**ГЕНЧАНОК Юліі** – студэнтцы 5 курса спецыяльнасці «Правазнаўства».

**СЕМЧАНКА Марыне** – студэнтцы 5 курса спецыяльнасці «Англійская мова».

**ІМЯ Я. КОЛАСА**

**ЯЎНЫХ Алесі** – студэнтцы 5 курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія» са спецыялізацыяй «Англійская мова».

**ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ**

**ШПІЛЕЎСКАЙ Наталлі** – студэнтцы 5 курса спецыяльнасці «Геаэкалогія».

## З узнагародай!

**За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, дасягнутыя поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў узнагароджаны:**

**ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**ШАЛУПАЕЎ Сяргей Вікенцьевіч** – дэкан фізічнага факультэта.

**ГРАМАТАЙ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**ГАПАНОВІЧ-КАЙДАЛАЎ Мікалай Уладзіміравіч** – дацэнт кафедры сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі;

**ГУСЕЎ Андрэй Віктаравіч** – дэкан геолага-геаграфічнага факультэта;

**ЖОГАЛЬ Сяргей Пятровіч** – дэкан матэматычнага факультэта;

**КУЛАЖАНКА Юрый Іванавіч** – першы прарэктар;

**МЯЗГА Мікалай Мікалаевіч** – дэкан гістарычнага факультэта;

**ХРАМЧАНКОВА Вольга Міхайлаўна** – дэкан біялагічнага факультэта;

**ШЧЭПАЎ Уладзіслаў Аляксандравіч** – дэкан эканамічнага факультэта;

**ЭСМАНТОВІЧ Ірына Ігараўна** – дэкан юрыдычнага факультэта.

***

**За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў, добрасумленную працу Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны:**

**БАГДАНОВІЧ Валянціна Іосіфаўна** – старшы выкладчык кафедры радыёфізікі і электронікі;

**КАРАСЁВА Галіна Леанідаўна** – к.ф.-м.н., дацэнт кафедры вылічальных машын і праграміравання;

**МАРЧАНКА Валянціна Іванаўна** – камендант вучэбнага корпуса №4.

## В ОКСФОРД – НА СТАЖИРОВКУ

Преподаватель кафедры теории и практики английского языка факультета иностранных языков университета Татьяна Сенина не устает удивлять своей настойчивостью и целеустремленностью: на этот раз молодому перспективному ученому удалось реализовать свою давнюю мечту пройти стажировку за рубежом и тем самым совершенствовать свои знания, на порядок повысить собственный профессиональный уровень. Татьяна получила исследовательский грант «Чивенинг» по программе постдипломного обучения. Так что ближайшие 9 месяцев гомельчанка проведет в Великобритании, в Волфсонском колледже Оксфордского университета – одного из самых престижных высших учебных заведений мира. Такой высокой чести Т. Сенина была удостоена в ходе тщательного конкурсного отбора, который она успешно прошла, опередив своих коллег из других вузов Беларуси.

Конференции

# В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ – РАБОТА СОЦИАЛЬНО-ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ И ПСИХОЛОГИЧЕСКОЙ СЛУЖБЫ

Недавно наш университет собрал в своих стенах ученых из ведущих вузов Беларуси, которые вместе с коллегами из ГГУ приняли участие в работе республиканской научно-практической конференции «Развитие профессиональной компетентности специалистов социально-педагогической и психологической службы». На ней были представлены Академия управления при Президенте Республики Беларусь, Национальный институт образования, Республиканский институт высшей школы, БГПУ им. М. Танка, ГрГУ им. Я. Купалы, высшие учебные заведения России.



В приветственном слове к участникам конференции проректор по научной работе д.т.н., профессор О.М. Демиденко акцентировал внимание на социальной значимости практических разработок в области гуманитарных наук.

О перспективах развития последипломного образования в нашей стране, в регионе в условиях структурной перестройки и реформирования экономики проинформировал в своем докладе проректор по учебной работе, директор ИПК и ПК ГГУ О.А. Малахов. В частности, он отметил положительную динамику роста у населения образовательных потребностей, в том числе в повышении имеющейся квалификации, переподготовке и получении второго высшего образования.

В своем выступлении на пленарном заседании д.п.н., заведующий кафедрой педагогики Ф.В. Кадол подчеркнул, что вынесенная на обсуждение, детальное рассмотрение проблема является для современного образования достаточно актуальной. Это связано с тем, что профессионально значимые личностные качества социального педагога, специалиста-психолога во многом определяют успешность процесса обучения, ориентированного на воспитание гармоничной, социально и творчески активной личности. Поэтому в поле зрения ученых оказались вопросы, затрагивающие методологические основы подготовки и практической деятельности специалистов социально-педагогической и психологической службы, проблемы формирования их профессиональной компетентности, а также отражающие основные направления деятельности социального педагога и практического психолога в системе современного образовательно-воспитательного пространства.

Шел также разговор о роли семейного и общественного воспитания в современном социуме, социально-педагогической работе с неблагополучной семьей, взаимодействии социального педагога с государственными учреждениями и общественными организациями, о его профессионализме, нравственной культуре и др.

На конференции выступили заведующие кафедр: социально-гуманитарных дисциплин института повышения квалификации и переподготовки кадров – Л.Д. Ермакова, социальной и педагогической психологии – Г.В. Гатальская, к.п.н., декан факультета психологии и довузовской подготовки Н.В. Гапанович-Кайдалов, к.п.н., доцент кафедры педагогики Н.И. Колтышева, другие ученые ГГУ.

Плодотворно проходила работа в 5 секциях, в которых были представлены свыше 130 научных докладов. В одной из них, – «Содержание и основные направления профессиональной деятельности социального педагога» активно участвовали студенты 3 и 4 курсов специальности «Социальная педагогика. Практическая психология». Тем самым они получили возможность расширить свои знания по указанной педагогической проблеме, приобрести опыт публичных выступлений.

(Наш корр.).

**На снимке: с докладом на пленарном заседании выступает д.п.н., профессор, декан педагогического факультета ГрГУ им. Я. Купалы В.П. Тарантей.**

**Фото В. ЧИСТИКА.**

Содружество

# РАДУШНО ВСТРЕЧАЛИ ГОСТЕЙ

Не часто встретишь в стенах ГГУ англоязычных юношей, одетых в шотландские юбки – килты, гольфы выше колена и характерные яркие галстуки, выдающие принадлежность своих обладателей к самому массовому молодежному движению в мире – скаутингу. Именно такую не совсем привычную для белорусских глаз картину можно было наблюдать в главном и первом учебных корпусах нашего вуза во время недавнего пребывания в нем делегации из города Абердина (Шотландия). В составе группы были скауты во главе с их руководителем – секретарем комитета управления общественной организации «Друзья Гомеля» Чарльзом Лоувом. В рамках своего визита в областной центр они побывали и в нашем университете, встретились с директором Молодежного комплекса А.В. Лысенковым, работниками студенческого клуба и узнали много интересного о разноплановой насыщенной деятельности, успехах и интересных новых проектах входящих в его состав творческих коллективов.



Надо заметить, некоторые из них уже не раз бывали в Абердине на различных конкурсах, а молодежь из этого шотландского города принимала участие в международном фестивале «Арт-сессия» в Гомеле. 17-летние школьники из Абердина пообщались и без труда нашли взаимопонимание также и с первокурсниками факультета иностранных языков.

Во время экскурсии по университету гости с интересом знакомились с многочисленными экспонатами Музея-лаборатории спортивной славы Гомельщины, о которых им рассказал его директор В.З. Марченко **(на снимке)**, посетили также музей животного мира Беларуси (он размещается во дворце студентов «Юбилейный»), совершили культпоход в выставочный зал главного корпуса. А благодаря четверокурснику факультета иностранных языков гр. А-43 Ивану Акуленко, выполнявшему миссию переводчика, они могли не только видеть, но и понимать весь смысл происходящего.

Так что в Шотландию ребята возвратились с багажом новых знаний, ярких воспоминаний, множеством фотоснимков, запечатлевших их новых белорусских друзей из Гомельского университета, пейзажи и достопримечательности города над Сожем. А для любого скаута, находящегося на пути духовного и интеллектуального развития, стремящегося к самосовершенствованию, это чрезвычайно важно и ценно.

(Наш корр.).

**Фото В. ЧИСТИКА.**

# МЫ – БЕЛАРУСЫ!

Нет ничего лучше ощущения гордости за свою страну, осознания себя как достойного ее гражданина! Именно поэтому воспитание патриотизма является неотъемлемой частью идеологии любого государства, стремящегося к процветанию и долголетию.

Возможно, эту цель ставили перед собой организаторы республиканской акции «Мы – беларусы!». Благодаря им в честь праздника – Дня города Гомеля, который состоялся в сентябре, его жителям был подарен концерт с аналогичным названием. Перед ними, а также гостями города над Сожем выступили известные и начинающие белорусские исполнители: И. Дорофеева, Т. Майсурадзе, группы «Палац» и «Пятый сезон», танцевальная группа Pops Foundation и др.

Каждый зритель услышал приятные для себя композиции, увидел любимых исполнителей. Молодежь с особым чувством встретила группу «Палац», от души подпевала знакомым композициям «Песняров» в исполнении рок-группы «Пятый сезон». Представители старшего поколения с удовольствием слушали лирические песни И.Дорофеевой.

Как обычно, БРСМ не остается в стороне от подобных акций. Так было и на этот раз. Благодаря ему многие узнали о том, что такой концерт состоится и имели возможность его посетить. Белорусские флаги, принесенные активистами организации, развевались над площадью на протяжении всего мероприятия, служа отличным к нему дополнением.

**Оксана РОМАНЬКО,**
**студентка 4 курса**
**экономического факультета.**

Акции

# ПОМНИМ О ПРОШЛОМ, СТРОИМ БУДУЩЕЕ

В рамках республиканской программы по возрождению историко-культурного наследия Беларуси и в связи со знаменательной датой – 90-летием со дня образования Всесоюзного Ленинского Коммунистического Союза Молодежи в нашем университете, равно как и в других вузах страны, стартовала акция по поддержке строительства памятника, посвященного ВЛКСМ. Он будет возведен в г. Минске у входа в Центральный парк около Комсомольского озера. Как будет выглядеть памятный знак, решит жюри специального конкурса. В его состав вошли молодые архитекторы, дизайнеры, скульпторы, а также учащиеся и студенты средних и высших учебных заведений соответствующих специальностей.

В нашем университете сбор денежных средств осуществляется первичной организацией ОО «БРСМ», в академических группах эта функция возложена на старост. Каждый студент имеет возможность поддержать акцию, внести свой посильный вклад (материальный взнос в размере 700 рублей) в общественно полезное дело и тем самым отдать дань уважения прошлому, которое осталось в памяти наших мам и пап, бабушек и дедушек, важным вехам истории Советского государства, связанным с комсомолом. Сегодня его современный последователь и правопреемник – Белорусский Республиканский Союз Молодежи строит свою деятельность, сохраняя добрые традиции старшего предшественника – ВЛКСМ. Ведь комсомольцы всегда находились на передовых позициях в жизни своей Родины, участвовали в строительстве важнейших промышленных и хозяйственных объектов в период индустриализации, подтверждали верность собственным высоким политическим и нравственным идеалам и в годы Великой Отечественной войны, сражаясь за мир на родной земле, и в послевоенное время, участвуя в ликвидации последствий разрушительного военного лихолетья. А это действительно не может подлежать забвению…

# ЧУТКИЕ СЕРДЦА

Все мы наслышаны о печально известных военных событиях в Южной Осетии, получивших в нашей стране широкий общественный резонанс. Несмотря на то, что эта огромная по своим масштабам и последствиям гуманитарная катастрофа разворачивалась за тысячи километров от Беларуси, и мы не слышали ни выстрелов, ни стонов раненых, а узнавали о происходящем из телевизионных сводок новостей, трудно было оставаться безучастными к чужой беде и особенно к страданиям осетинских детей. Именно они явились адресатами благотворительной акции по сбору денежных средств, которая недавно проходила в нашем университете. Ее инициатором стала активистка первичной организации БРСМ геолого-географического факультета Анна Кухаренко, а наиболее щедрыми оказались студенты факультета иностранных языков. Весомым был вклад в общее доброе дело и будущих физиков.

Прекрасно осознавая, какое значение имеет даже самый незначительный взнос, организаторы стремились привлечь к акции как можно больше участников. И каждый, делая добровольное пожертвование, делился с обездоленными мальчиками и девочками из Осетии не просто деньгами, а своей добротой, человеческим теплом. На собранные материальные средства куплены фломастеры, карандаши, игрушки. Хочется верить, что они принесут ребятишкам из Южной Осетии радость и помогут им возвратиться в мирное счастливое детство, в котором больше не будет места для войны.

**Виктория БОРТНЕВСКАЯ,**
**студентка гр. БУ-11 экономического факультета.**

# ДЕБАТЫ КАК ФОРМА СПЛОЧЕНИЯ МОЛОДЕЖИ

Не первый год в университете успешно действует дебат-клуб, созданный студентами юридического факультета. Участие в его работе помогает молодежи адаптироваться к ее будущей сфере деятельности, учит логически мыслить, правильно строить свою речь, творчески подходить к решению проблем, развивает способность убеждать. Это также помогает студентам постепенно вводить в лексику специальную терминологию.

18 сентября вновь взял старт сезон дебатов. В учебном корпусе № 2, на их открытии, в зале царил аншлаг. Среди зрителей и участников были студенты не только юридического факультета и не только нашего университета. Присутствовала на дебатах и декан юрфака И.И. Эсмантович. Очень интересно было понаблюдать за развитием дискуссий.

В дебатах команды-участницы – «правительства» и их оппонент – «оппозиция» вели спор: правительство, обосновав свое решение, предлагало ввести какие-либо новшества (например: отменить стипендию или закрыть буфеты в университете). А оппозиция должна была опровергнуть все доводы и предложения правительства и доказать обратное. Зрелище было захватывающее!

В новом сезоне дебат-клубом взят отличный старт! Пожелаем ему дальнейших удач!

Для студентов, участников клуба, дебаты стали любимым хобби, приятным времяпровождением. Состязания уже вышли за рамки университета, проводятся на различных уровнях: городском, междугороднем, международном.

Полезная информация для тех, кого заинтриговала эта публикация, кто не прочь попробовать свои силы в области юриспруденции, одним словом, для творческих личностей: заседания проводятся по **четвергам в 19.20 в корпусе № 2 по ул. Кирова, 119, аудитория 4-15**. Руководителем клуба является Татьяна Студнева (юрфак). По интересующим вас вопросам можно обращаться к ней по телефону: 127-40-56.

**Анна ХОМЧЕНКО,**
**студентка гр. ГУ-11**
**экономического факультета.**

**(Информационная служба ПО ОО «БРСМ» ГГУ)**

Літаратурныя дэбюты

# «ПАКУЛЬ МАГЧЫМА – ДЫХАЙ І ПІШЫ...»

**У верасні ў мінскім выдавецтве «Кнігазбор» убачыла свет першая ў творчай біяграфіі пачынаючага паэта студэнта 3 курса філалагічнага факультэта ГДУ Алеся Бараноўскага кніга – зборнік вершаў «Чуйнае акно». У яго ўвайшлі каля 50 паэтычных твораў, большасць з якіх прысвечаны патрыятычнай і ваеннай тэматыцы. У выданні знайшлі сваё эмацыянальна-вобразнае адлюстраванне і асабістыя пачуцці маладога аўтара, яго філасофскія разважанні аб жыцці.**

Для Алеся яно «не параўнаецца ні з чым» і мае свае высокія мэту і сэнс: «пакуль магчыма – дыхай і пішы». Таму юнак знаходзіць асалоду менавіта ў творчасці і верыць – плён яго душы не будзе марным, і «не засохне пяро, што засее аднойчы радкі».

А між іншым гэтыя спадзяванні небеспадстаўныя, бо паэтычны дэбют А. Бараноўскага прызнаны паспяховым і членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі, знакамітымі творцамі Гомельшчыны, у тым ліку Ю. Фатневым, М. Болсунам, Л. Возісавай. Яны выказалі свае аўтарытэтныя меркаванні наконт мастацкай вартасці паэтычнага зборніка «Чуйнае акно» падчас яго прэзентацыі, якая адбылася нядаўна ў гарадской бібліятэцы імя Герцэна і супала з прэзентацыяй дзіцячай кнігі вядомага гомельскага аўтара Ніны Шклярвай.



**На здымку: Алесь Бараноўскі на прэзентацыі свайго зборніка разам з паэтэсай Нінай Шкляравай.**

**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

На думку прызнаных майстроў слова, Алесь распачаў няпросты шлях у вялікую літаратуру ўдала і ўпэўнена, мае сваё бачанне свету, па-новаму падыходзіць да раскрыцця спрадвечных тэм, «прарэзваецца» у яго і ўласны паэтычны голас, паступова выпрацоўваецца адметны стыль і манера пісьма. А гэта – сур'ёзная заява, добры задзел на будучыню, таленавітая і цікавая прадмова да больш значнага і змястоўнага твору.

Трэба заўважыць, вершы студэнта ўжо не раз друкаваліся ў абласных і рэспубліканскіх газетах і часопісах, а таксама ў калектыўных зборніках паэзіі «Натхненне» (2007 г., Мазыр) і «ШматгалоссеПалесся» (2007 г., Гомель). Алесь з' яўляецца дыпламантам раённага конкурсу бардаўскай паэзіі і песні «Веселые струны души», лаўрэатам першага літаратурнага конкурсу імя Кірылы Тураўскага, пераможцам паэтычнага конкурсу імя Анатоля Грачанікава, адзначаны Архіерэйскай граматай Беларускай праваслаўнай царквы.

Дзяцінства і школьныя гады А. Бараноўскага прайшлі ў вёсцы Церуха Гомельскай вобласці. Шчымлівыя пачуцці да малой радзімы, зачараванасць мілагучнасцю роднай мовы не раз натхнялі на напісанне вершаваных твораў і гарэзлівага шасцікласніка Сашу, і сталага юнака Алеся – студэнта універсітэта. Толькі дарэмна пытаць у яго, адкуль бяруцца, як нараджаюцца вершы – апісаць гэты патаемны творчы працэс немагчыма, як нельга дакладна вызначыць колькасць зорак на начным небе ці прымусіць сябе не думаць, не адчуваць, не марыць... Алесь называе сябе летуценнікам і рамантыкам, імкнецца спасцігнуць навакольны свет у самых розных яго праявах, вельмі цівавіцца тэатрам і ўсім, што звязана з акцёрскім рамяством.

Разам з тым ён бачыць сваё прызначэнне выключна ў паэзіі, а вершы, складзеныя ім, як заўважыла першая дарадца, настаўніца і старэйшая калега маладога творцы Ніна Шклярава, ідуць ад жыцця і маюць добрую класічную аснову. Лірычны герой яго твораў ні ў якіх абставінах не страчвае веру ў лепшае, нават калі «сэрца апранулася ў колеры болю», шануе святыя паняцці Маці, Радзіма, Мова, агульначалавечыя духоўныя каштоўнасці ўспрымае як надзейныя арыенціры ў жыцці.

А сама назва зборніка – «Чуйнае акно» – гучыць нібыта запрашэнне да задушэўнай размовы са шчырым субяседнікам, здольным на спагаду і спачуванне. Яму нельга не паверыць, немагчыма не даверыцца. З ім хочацца сустракацца зноў і зноў – аб важных жыццёвых ісцінах ён гаворыць пранікнёна, хвалююча, проста, і словы гэтыя «будзяць сумленне, наперад вядуць, сэрца спагадаю лечаць».

Юнак прызнаецца, што назаўсёды ўлюблёны ў вершы вядомай беларускай паэткі Яўгеніі Янішчыц з іх вобразнасцю і шчырасцю пачуцця. Алесь удзячны лёсу, які падарыў яму сустрэчу з такімі людзьмі, як Ніна Шклярава, Васіль Ткачоў, Тамара Кручэнка, Уладзімір Гаўрыловіч, што аказалі значны ўплыў на станаўленне яго творчасці, а таксама выкладчыкам філалагічнага факультэта ГДУ, Школе маладога літаратара пры Гомельскім аддзяленні Саюза пісьменнікаў, членам савета якой ён з'яўляецца.

Жадаем маладому аўтару, каб і ён знайшоў і не губляў свайго ўдзячнага чытача, а яго любоў да паэзіі была ўзаемнай, доўгай і шчаслівай...

**Т. КАЗЯРОЖАЦ.**

На конкурс | 14 кастрычніка – Дзень Маці

## УСМЕШКА СОНЦА

Да чыіх далоняў як да засцерагальнікаў ад розных непагадзяў мы звяртаемся? Чые вочы сярод іншых адразу запальваюць у сэрцы нязгасную надзею на лепшае? Чые плечы – апірышчы як у жыцці наогул, так і ў кожным канкрэтным выпадку?

Так, мацiны...

Усмешка маці сцішвае боль, як сонейка, высушвае слёзы і ў адказ запальвае на твары не менш бліскучую ўсмешку.

Рукі маці – гаючае лісце да ран як на целе (дастаткова ўспомніць, да каго першага беглі, калі абадралі калена ці прыціснулі пальчык у дзвярах), так і на сэрцы. Бо ніхто акрамя маці не аднясецца да тваіх праблем, як да сваіх уласных. Яна і выслухае, і спагадае, і падкажа...

Сэрца маці... Цяжка сабе ўявіць, колькі ўсяго яно вымушана вытрываць за свой век! Тут і радасць за першыя крокі дзіцяці, недасыпанне за першыя зубы, шчасце за першыя словы. Затым – школа. Першыя ўрокі, першыя адзнакі, поспехі і няўдачы. За ўсё гэта шчыра перажывае і матуля. Не лягчэй сэрцу маці і далей: экзамены, паступленне, вучоба... Што ўжо казаць пра вяселле свайго дзіцяці ды гадаванне ўнукаў!.. Нягледзячы на ўзрост дзіцяці, маці гэтак жа шчыра, як у першы раз, будзе за яго перажываць, для яе яно застанецца дзіцём да апошняга ўздыху. Ласкавым і непаслухмяным, дарослым і няўрымслівым, непаседам і ўдумлівым слухачом адначасова.

Таму і нам трэба быць больш разважлівымі, каб нашы матулі менш за нас перажывалі. І ўспамінаць іх трэба не толькі тады, калі грошы скончацца, ці са святам павіншаваць з'явіцца патрэба, а ў звычайны будзённы дзень. Бо для маці ўжо за шчасце чуць любы голас яе дзіцяці. Як лёгка тадыператварыць будзённы дзень у святочны!

Таму і ставім сабе за мэту зрабіць нашых матуль шчаслівымі. Бо да чыіх далоняў у такім выпадку будзем звяртацца, шукаючы цяпло і падтрымку?

Дзякуй, матуля. Дзякуй!..

**Марына МАРКЕВІЧ,**
**студэнтка гр. БА-33**
**філалагічнага факультэта.**

***

Летят года неумолимо,
Взрослеем мы не по часам,
Стареют бабушки и мамы,
Стремятся все к своим мечтам!

Века сменяются веками,
Но в жизни истина одна:
Среди невзгод, ветров, цунами
Почет и гордое «Ура!»

Тем, кто отдал нам свою нежность,
Кто просто научил нас жить,
Кто рассказал, что значит верить
И до беспамятства любить.

Бабуле громкое «Спасибо!»
И низкий до земли поклон
За то, что поровну всех любит,
И с одинаковым теплом.

Спасибо маме за терпенье,
За то, что вырастить смогла,
За то, что ночками не спала,
Не отходила от меня!...

Летят года неумолимо,
Взрослеем мы не по часам.
Родные бабушки и мамы,
«Спасибо» говорим мы вам!

***

...Как мы без них в этом огромном и суровом мире? Кто, как не они, подадут нам руку помощи в нужный момент? Кто окажется рядом в порой безвыходной ситуации? Конечно, самые понимающие и добрые наставники по жизни – наши родители!

Огромную роль в жизни каждого ребенка играет мама. Это человек, который дает нам жизнь, ведет по пути истинному, не позволяет с него свернуть, помогает и поддерживает.

Мамы «ставят нас на ноги» и дают первые уроки жизни.

С материнским теплом каждому человеку прививаются самые положительные эмоции, чувства и знания. Мамы учат нас ценить и уважать, любить и почитать.

С этими ценностями мы шагаем во взрослую, самостоятельную жизнь.

Наш долг перед ними велик! Мы, дети, должны бережно к ним относиться, не огорчать по пустякам, помогать и каждый раз напоминать им о том, что роднее и ближе у нас никого нет!

**Елена МИРОШНИКОВА,**
**студентка гр. ПС-42**
**факультета психологии и довузовской подготовки.**

Милосердие

# ДЕЛАТЬ ЛЮДЯМ ДОБРО – НАШЕ ПРИЗВАНИЕ

В этом исповедально признались первокурсникам-историкам на встрече, состоявшейся в начале учебного года, студенты 5 и 2 курсов – члены волонтерского общества «Друг детей». Они рассказали о реализации проектов «Мы служим детям» в Журавичском доме-интернате для детей-инвалидов, «Чтобы жизнь была в радость» в Старо-Дятловичской больнице сестринского ухода, в доме-интернате для ветеранов войны, труда и инвалидов «Васильевка». Говорили о своем видении значимости добровольческой деятельности для их нравственного самосовершенствования.

37 историков 1 курса благодарно откликнулись на призыв быть в рядах волонтеров. И вскоре вместе с пятикурсниками в рамках благотворительной акции «Осень – пора милосердия» они побывали с визитом в Васильевке, где очень душевно поздравили с годовщиной свадьбы наших друзей – молодых инвалидов Виктора и Любовь Бадиных. Замечательно, что в праздничной дискотеке принимали участие не только студенты, но и хозяева. Это был общий гимн любви. Большинство людей озабочены более всего тем, чтобы быть любимым, а не тем, чтобы самому быть способным любить. Год совместной жизни молодоженов показал их способность любить самозабвенно и преданно. С нескрываемым волнением рассматривали гости свадебный альбом как отражение событийного явления в жизни интерната. Растроганным виновникам торжества вручили подарки от профкома студентов, историков, окончивших в этом году университет, групп И-11, И-12, ИА-13, БУ-21 **(на снимке)**.

Порадовали мы подарками многих обитателей этого большого Дома, которые в свою очередь пригласили нас на выставку собственных творческих работ.

По возвращении студенты гр. ИА-13 поделились своими мыслями и чувствами о поездке.



**Татьяна КОЛЕСНИКОВА:**

– Когда я ехала в Васильевку, то знала, что эта поездка произведет на меня огромное впечатление. Так и случилось. Тем, кто там живет, очень нужна наша любовь, наша дружба, им не нужна жалость... В суматохе дней мы не ценим тех, кто рядом, мы утрачиваем способность любить – любить по-настоящему, не жалея себя. Все то время, на протяжении которого мы находились в доме для инвалидов, у меня внутри сжималось сердце, и одновременно я была очень счастлива, что могу быть нужной, делаю что-то важное для других людей. Мне сразу захотелось прижаться к моим родителям и сказать, что я счастлива, что у меня было безоблачное детство, что я всегда чувствовала себя любимой... Я знаю точно, что я должна, я обязана максимально поделиться той частичкой любви, которую дают мне мои родные... Я убеждена в том, что такие поездки делают нас лучше, сильнее, мудрее и терпеливее друг к другу. Сколько любви, сколько искренности в глазах, в сердцах молодой пары Любы и Вити! Они умеют ценить каждую секундочку, каждое мгновение, проведенное друг с другом...

**Каролина ПУШКОВА:**

*– Для нас, привыкших создавать проблемы на ровном месте, там – другой мир. Мне хочется еще поехать туда, к этим самым лучшим людям на Земле. Если мы, заядлые материалисты и эгоисты, можем чем-то им помочь, так это же СУПЕР!*

**Ольга СУШКОВА:**

*– Мне очень понравилась поездка, а особенно коллектив ребят волонтерского общества «Друг детей».*

Милосердие требует не только щедрости, но и духовной чуткости, нравственной зрелости, и человеку надо самому возвыситься до добра, искоренить в себе зло, чтобы суметь другому сделать добро.

**Т. ГАРАНИНА,**
**доцент кафедры философии,**
**руководитель общества «Друг детей».**

***

*От имени коллектива и подопечных Старо-Дятловичской больницы сестринского ухода хочу выразить благодарность членам волонтерского общества «Друг детей». Каждый их приезд для наших пациентов – это праздник, лучик солнца в их жизни... Вы бы видели глаза наших стариков, когда они встречают ребят, ведь каждый воспринимает их как своих внуков. Каждое такое посещение долго еще обсуждается ими, и они часто задают мне вопрос: «Когда опять к нам приедут студенты?».*

*Я совсем недавно тоже была студенткой, поэтому хорошо понимаю, как трудно совмещать такую деятельность с учебой. Я думаю, что из этих ребят после окончания университета получатся не только хорошие специалисты, но и прекрасные люди, готовые откликнуться на чужую беду. Благодаря таким обществам, как «Друг детей» хочется, несмотря ни на что, жить дальше.*

***С уважением заведующая Старо-Дятловичской больницы сестринского ухода Ольга Витальевна Усова.***

Духоўная спадчына

**Плённая работа па захаванню традыцыйнай духоўнай культуры Гомельшчыны вядзецца на філфаку ГДУ, у прыватнасці, калектывам кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі. Толькі за апошні час намаганнямі яе супрацоўнікаў разам з навукоўцамі кафедр рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, беларускай мовы, беларускай літаратуры ў рамках міжнароднага і рэгіянальнага праектаў падрыхтаваны і выдадзены кнігі па народнай духоўнай культуры Брагіншчыны, Гомельскага раёна і інш. Завяршаецца праца над аналагічным выданнем па Жлобіншчыне. А ў самай бліжэйшай перпектыве – выхад кнігі, якая раскажа аб абрадах і звычаях, знакамітых людзях Лагойскага раёна Мінскай вобласці. (Паміж ГДУ і Лагойскім райвыканкамам падпісаны адпаведны дагавор). Невыпадкова летам туды адправіліся на фальклорную практыку студэнты-філолагі.**

# ГОМЕЛЬСКІЯ СТУДЭНТЫ – НА ЛАГОЙШЧЫНЕ

На пачатку ліпеня ў наш раён прыязджала вялікая група студэнтаў-філолагаў Гомельскага ўніверсітэта, якія пасля заканчэння першага курса пашыралі і замацоўвалі веды ў галіне этнаграфіі і фальклору. Ім прадстаяла сустрэцца са старажыламі, запісаць абрады, звычаі, паданні, легенды, павер'і, забабоны, даўнія песні.З разуменнем аднеслася да патрэб студэнтаў-практыкантаў кіраўніцтва мясцовага філіяла прафесійнага вучылішча, якое выдзеліла месца ў інтэрнаце. Пайшла насустрач адміністрацыя Плешчаніцкай школы № 1: студэнты мелі магчымасць харчавацца ў школьнай сталовай.

Умела арганізавала практыку сваіх падапечных гр. БФ-11 кіраўнік групы – прафесар, доктар філалагічных навук В.С. Новак. Паспрыяла тая акалічнасць, што Валянціна Станіславаўна – наша зямлячка, ураджэнка вёскі Акцябр, ведае мясцовасць, мае тут нямала блізкіх людзей. Яна знайшла падтрымку і садзейнічанне з боку намесніка старшыні райвыканкама Г.В. Даўгуновай. Істотна дапамаглі педагогі Акцябрскай СШ Т.В. Каролік, Г.В. Сабалеўская, С.С. Шульская, У.Я. Шульскі, які прадставіў у распараджэнне гасцей асабістую легкавую аўтамашыну.

Вельмі рацыянальна і з поўнай аддачай быў выкарыстаны студэнтамі час, адведзены на пошукавую дзейнасць. Ужо на наступны пасля заезду дзень яны змаглі пабываць у васьмі бліжэйшых вёсках, завітаць да некаторых плешчаніцкіх старажылаў. Нават у свята, 3 ліпеня, калі для іх быў выдзелены аўтобус мясцовай аўтабазы, даследчыкі нашага краю, разбіўшыся на групы, наведалі шмат населеных пунктаў у накірунку ад Казыроў да Пасадца. Не менш плённым выдалася 4 ліпеня, калі на мікрааўтобусе аддзела культуры яны пабывалі ажно ў 12 вёсках, мелі сустрэчы з патрэбнымі ім людзьмі. А ўвогуле, за час актыўнай даследчыцкай дзейнасці будучыя філолагі змаглі наведацца ў 33 вёскі, што знаходзяцца на тэрыторыі сямі сельсаветаў.

Былі шматлікія запамінальныя сустрэчы з жыхарамі сталага веку, якія ахвотна ўступалі ў гутарку з моладдзю, давалі змястоўныя адказы на ўсе пытанні. У вёсцы Хадакі, напрыклад, добрых паўгадзіны доўжылася размова з 95-гадовай Нінай Іванаўнай Гуніч. Прыгадала жанчына, як у даўні час спраўлялі ў іхняй вёсцы розныя абрады, як ладзілі калядную жартоўную гульню «Жаніцьба Цярэшкі», якія рытуальныя дзеянні выконвалі, каб наклікаць дождж і пазбегнуць граду, як варажылі на Каляды і «Саракі». Цікавыя казкі, паданні, трапныя анекдоты запісалі студэнты са слоў жыхара вёскі Нарбутава Івана Іванавіча Гусакоўскага. Пра даўні звычай святкавання «Святога Антонія» расказалі Ядвіга Аляксандраўна і Антон Адамавіч Акулічы са Старога Чэрнева. Песні, што засталіся ў спадчыну ад матуль і бабуль, ахвотна праспявалі для запісу Паліна Іосіфаўна Буйка і Галіна Сямёнаўна Зубарава (в. Юльянава), Марыя Іванаўна Анкуда (в. Глыбачаны), Яўгенія Нікандраўна Рыбчак (в. Дзераўно). Прыгожыя тканыя вырабы ўласнай работы паказала завітаўшым да яе дзяўчатам жыхарка в. Бурыя Ніна Іванаўна Лапцэвіч. І такіх прыкладаў можна прывесці нямала.

Падчас паездкі я меў гутарку з удзельнікам даследчыцкай акцыі Пятром Цалка. З непрыхаванай шчырасцю хлопец дзяліўся ўражаннямі ад убачанага і пачутага на нашай Лагойшчыне: – Мяне кранула дабрыня, адкрытасць, гасціннасць людзей, з якімі даводзілася сустракацца, – гаварыў Пётр. – А яшчэ іх гатоўнасць падзяліцца крупінкамі скарбу народнай культуры, што дасталіся ад продкаў. Нам жа трэба паспець сабраць, зафіксаваць усё, што яшчэ можна ўзнавіць, каб перадаць як эстафету будучым пакаленням. Сам я мяркую падчас летніх канікул заняцца зборам этнаграфічных матэрыялаў на сваёй радзіме – у Лельчыцкім раёне.

Ёсць падставы для задавальнення вынікамі студэнцкай практыкі кіраўніка групы – прафесара В.С. Новак. Сабраны даволі багаты каштоўны матэрыял, які пасля апрацоўкі знойдзе месца ў гістарычна-этнаграфічным зборніку, прысвечаным мінуламу Лагойшчыны.

**Віктар НЕСЦЯРОВІЧ,**
**старшы навуковы супрацоўнік Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея.**

# ДОБРО ПОЖАЛОВАТЬ ИЛИ НЕ ПОСТОРОННИМ ВХОД РАЗРЕШЕН!

**Как быстро летит время! Кажется, совсем недавно я окончил школу, поступил в университет. Сейчас, выдержав не одну экзаменационную сессию, сдав множество экзаменов и зачетов, могу назвать себя опытным студентом, и мне хорошо известно, насколько важна поддержка и помощь первокурсникам, у которых студенческая пора только началась.**

Так, для более 100 таких «новичков», проживающих в общежитии университета № 1 по ул. Советской, 83ª, была организована экскурсия в музей-лабораторию Ф. Скорины, и они смогли познакомиться с богатой на события и интересной историей ГГУ. В рамках насыщенной культурной программы новоиспеченные студенты посетили также выставочный зал, получили возможность увидеть и оценить по достоинству оригинальные и талантливые работы известного гомельского скульптора Е. Богомаза.

Так что после быстротечных летних каникул студенческая жизнь вовсю набирает обороты. В общежитии №1 заботятся о том, чтобы она действительно была нескучной: возобновляют свою работу кружки по интересам, а недавно прошел шахматно-шашечный турнир.

А между тем очень скоро в нашем вузе состоится традиционный и всеми любимый конкурс «А ну-ка, первокурсник!» – своеобразное творческое боевое крещение для представителей первого курса всех факультетов университета. Пусть оно пройдет весело и зажигательно!

**Ю. ПИЛЬКЕВИЧ,**
**студент гр. БФЖ-43 филфака.**

# ХОРОШЕЙ БЕГУНЬЕ ШПИЛЬКИ НЕ ПОМЕХА!

... Это были самые необычные соревнования в жизни второкурсницы факультета физической культуры нашего университета Ирины Савостевой. И дело не только в том, что девушка первой преодолела финишную черту в забеге на 60 м, – состязаться со своими многочисленными соперницами ей пришлось, будучи обутой не в удобную спортивную обувь, а в изящные туфельки на высоком каблуке! Именно такие условия поставили перед отчаянными и смелыми модницами организаторы первого в Беларуси забега на шпильках. Он прошел в Пионерском скверике Гомеля в рамках празднования в городе Всемирного дня красоты.



Фото В. ЧИСТИКА.

Надо заметить, Ирина с 9 лет занимается легкой атлетикой, что во многом и предопределило ее победу в зрелищном состязании под названием «Красотки на старте». Доказав в напряженной борьбе, что хорошей бегунье даже шпильки высотой 12 см не помеха, студентка в качестве награды за свои усилия и настойчивость получила мобильный телефон «Самсунг» и огромный букет цветов.

Спорт Спорт Спорт

# ДЗЮДОИСТЫ СИЛЬНЫ ТЕЛОМ И ДУХОМ

В Гомельском центре олимпийского резерва единоборств прошел чемпионат области по дзюдо среди мужчин и женщин. На татами вышли представители спортивных школ всех районов Гомельщины.

Виктор Александрович Внучкин, заслуженный тренер Беларуси и главный судья соревнований пояснил: «Среди более полусотни участников были чемпион Европы Сергей Шундиков, призер первенства Европы Алексей Ставший и другие знаменитые дзюдоисты. Победителями чемпионата стали 14 человек – 7 у мужчин и столько же у женщин».

Один из выигравших состязание – студент 5 курса заочного факультета специальности «Физическая культура» нашего университета Павел Дорофеев (категория 100 кг, представляет г. Чечерск). Павел был также участником XXIX Олимпийских игр в Пекине. Тренирует спортсмена чемпион Гомельской области по дзюдо Константин Полей.

На вопрос, сколько всего побед им одержано, Павел дать ответа не смог: он просто-напросто сбился со счету. А вот какую пользу приносит дзюдо, рассказал охотно:

– Занимаюсь дзюдо 17 лет, этот вид спорта воспитал во мне такие качества, как самообладание, выдержка, воля. Многие считают дзюдо спортивной борьбой, построенной на заломах, захватах и бросках. Это представление правильное, но не совсем полное. Прежде всего, дзюдо – это философия, искусство, основанное на двух важных принципах: выявление сильных и слабых сторон противника, наилучшее максимальное использование силы тела и духа. Любой дзюдоист должен быть мужественным, проявлять настойчивость и обязательно с уважением относиться к своему сопернику.

Кстати, прошедший чемпионат явился первым этапом подготовки к очередным Олимпийским играм, которые состоятся в 2012 году в Лондоне.

Пожелаем Павлу и все остальным борцам удачи и побед!

**Екатерина КАЗАКОВА,**
**студентка гр. РФ-21 филфака.**

# ВНОВЬ В ПРИЗЕРАХ

В Минске завершилась Спартакиада вузов Беларуси по баскетболу среди мужских команд.

Десять студенческих дружин были разбиты на две подгруппы. Во второй из них наши баскетболисты победили команды Белгосуниверситета со счетом 85:63, Витебского госуниверситета – 91:75 и Могилевского госуниверситета – 80:70. Но одержать верх над игроками Гродненского аграрно-экономического университета не смогли – 73:83.

В полуфинале наши ребята вновь уступили спортсменам Белорусского национального технического университета – 85:93. В борьбе за третье призовое место дружная команда ГГУ победила баскетболистов Белорусского университета информатики и радиоэлектроники – 107:81.

Чемпионами стали баскетболисты Гродненского аграрно-экономического университета, а серебряные жетоны завоевала команда БГУ.

Лучшим нападающим турнира признан Вячеслав Остриков, второкурсник заочного факультета специальности «Физическая культура» ГГУ. Хорошо провели турнир капитан нашей команды Игорь Телепнев (5 курс) и Кирилл Ситник (2 курс).

Несколько приятных слов хочется высказать в адрес нашего главного тренера, преподавателя кафедры спортивных дисциплин Сергея Николаевича Кулешова. Благодаря ему изменился учебно-тренировочный процесс и команда приобрела свой почерк, стала чаще одерживать победы. И это при том, что в г. Минске судьи прямо или косвенно отдают предпочтение столичным вузам.

В последние три года наши баскетболисты завоевывали бронзовые и серебряные награды Спартакиады. Впереди главная мечта – стать чемпионами!

**Виктор МАРЧЕНКО.**

## Улыбнитесь!

Идет экзамен в вузе, сидят преподаватели, приглашают первого абитуриента, спрашивают:

– Сколько будет 2 + 2?

– Три.

– Нет!

– Пять!

– Нет!

– Шесть!

– Неправильно! Да... дурак, но ищущий... Берем!

Заходит второй абитуриент.

– Сколько будет 2 + 2?

– Три.

– Нет!

– Три.

– Неправильно! Да... дурак, но настырный... Берем!

Заходит третий абитуриент.

– Сколько будет 2 + 2?

– Четыре, конечно!

– Да... умный. Но мест нет!

***

Студент периодически опаздывает на лекции. Профессор раздражительно спрашивает:

– Вы служили в армии?

– Да.

– Ну и что говорил вам старшина, когда вы опаздывали на построение?

– Здравия желаю, товарищ лейтенант!


**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ**

**аб' яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад на 5-гадовы тэрмін па кафедрах:**

-беларускай мовы – дацэнта;
-тэорыі і практыкі англійскай мовы – выкладчыка;
- матэматычных праблем кіравання – асістэнта, дацэнта;
-оптыкі – загадчыка кафедры, прафесара;
-агульнай фізікі – асістэнта (2);
-рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства – асістэнта;
-заалогіі і аховы прыроды – асістэнта;
-лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту – старшага выкладчыка;
- спартыўных дысцыплін – старшага выкладчыка;
-эканамічных тэорый – асістэнта;
-сацыяльна-гуманітарных дысцыплін інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў – асістэнта;
-агульнай фізікі – асістэнта;
-радыёфізікі і электронікі – дацэнта.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ.**



Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных дадзеных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася дадзеных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — УА «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны».

Наш адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 60-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.
Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на ОАО «Полеспечать», г.Гомель,ул.Советская,1.
Ответственность за качество печати несет ОАО «Полеспечать».
Качество печати соответствует качеству оригиналов заказчика.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4471.
Падпісана да друку 7 кастрычніка ў 11.30.